УДК 373.5:821.161.3Быков

# ВОБРАЗЫ ПАЛІЦАЯЎ І ФАШЫСТАЎ У АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА "ЗНАК БЯДЫ": АСАБЛІВАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ДА ЎРОКА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (XI клас)

**А. М. Макарэвіч**
(Установа адукацыі «Магілеўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова»,
кафедра літаратуры і міжкультурных камунікацый)

*Асаблівасці падрыхтоўкі ўрока беларускай літаратуры па тэме "Вобразы паліцаяў і фашыстаў у аповесці В. Быкава "Знак бяды" (XI клас) характарызуюцца ў кантэксце арганізацыі настаўнікам папярэдняга самастойнага чытання вучнямі твора, падрыхтоўкі школьнікамі дзённіка чытача па творы, распрацоўкі настаўнікам сістэмы апераджальных заданняў да ўрока. Звяртаецца ўвага на скіраванасць навучальных мэт урока: фарміраванне ўменняў параўноўваць асобныя кампаненты тэксту (часткі, раздзелы, эпізоды) з мэтай характарыстыкі вобразаў літаратурных герояў, асэнсавання аўтарскай канцэпцыі характару чалавека ва ўмовах сацыяльных катаклізмаў.*

Метадычныя зыходныя ў сістэме перспектыўных ліній (СПЛ) пры падрыхтоўцы ўрока па дадзенай тэме наступныя: а) эфектыўная арганізацыя настаўнікам папярэдняга самастойнага чытання вучнямі твора, скіраванае на цэласнае яго ўспрыманне і накапленне неабходных мастацкіх фактаў для выканання апераджальных заданняў да адпаведнага ўрока і напісання вучнямі творчай работы; б) падрыхтоўка школьнікамі дзённіка чытача па творы; в) распрацоўка настаўнікам сістэмы апераджальных заданняў да ўрока па адпаведнай тэме.

Навучальныя мэты ўрока па дадзенай тэме: а) фарміраванне ўменняў параўноўваць асобныя кампаненты тэксту (часткі, раздзелы, эпізоды) з мэтай характарыстыкі вобразаў літаратурных герояў; б) асэнсаванне складнікаў аўтарскай канцэпцыі чалавечай асобы.

Тэма ўрока павінна разглядацца з улікам наступных сэнсаўтваральных аспектаў: а) асноўныя канфлікты; б) асаблівасці сюжэту, кампазіцыі; в) сістэма герояў аповесці; г) мастацка-выяўленчыя сродкі; д) ідэйны змест твора, е) сюжэтныя і вобразныя складнікі мастацка-філасофскай канцэпцыі пісьменніка пра чалавека і яго лёс на катастрафічных паваротах гісторыі

У сувязі з акрэсленымі вышэй палажэннямі звернемся да тэзіснага раскрыцця іх метадычнай рэалізацыі ў працэсе падрыхтоўкі ўрока беларускай літаратуры па тэме "Вобразы паліцаяў і фашыстаў у аповесці В. Быкава "Знак бяды" (XI клас).

1. Апераджальнае заданне – скіравана ў СПЛ на чытанне, успрыманне і асэнсаванне тэксту аповесці[1] ў праекцыі на перспектыву падрыхтоўкі да ўрока па дадзенай тэме, а таксама напісання творчай работы па адной з прапанаваных тэм[2]. Змест апераджальнага задання: у працэсе чытання аповесці рыхтаваць дзённік чытача[3], дзе павінны быць зафіксаваны факты з рэальнага і рэтраспекцыйнага мастацкага свету твора для характарыстыкі наступных пытанняў: а) мастацкі час і мастацкая прастора, у якіх раскрываюцца характары герояў аповесці; б) сістэма літаратурных герояў; в) непасрэдныя і апасродкаваныя характарыстыкі літаратурных герояў твора, якія адпавядаюць тэме ўрока; г) асаблівасці сюжэту і кампазіцыі для раскрыцця

[1] Заданне па чытанні твора буйной эпічнай формы задаецца за некалькі тыдняў да першага ўрока па творчасці пісьменніка.

[2] Адна з магчымых тэм творчых работ, паводле прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання, – сачыненне-разважанне "Што такое здрада і хто такі здраднік?" [3, с. 65]. На наш погляд, да тэматыкі творчых работ па аповесці (вучні выбіраюць цікавую для іх тэму) варта далучыць і такую, як "Вобразы паліцаяў і фашыстаў у аповесці В. Быкава "Знак бяды": асаблівасці іх мастацкага адлюстравання". Такая тэма скіравана да ўвагі здольных вучняў. Яна дазволіць больш доказна ахарактарызаваць вобраз Гужа, для якога прысутнасць фашыстаў на хутары Багацькаў, нягледзячы на іх нялюдскасць у адносінах да гаспадароў сядзібы, з'яўляецца пэўным стрымліваючым фактарам і ў той жа час умацаваннем яго псіхалагічнай устаноўкі на абсалютную ўладу над Багацькамі, на іх пакаранне ў час, калі няма побач акупантаў.

[3] Прапанаваная ніжэй структура дзённіка чытача ўжо павінна быць вядома адзінаццацікласнікам. Для кожнага твора вялікай эпічнай формы яна напаўняецца зместам з улікам наступных складнікаў СПЛ: тэматыка ўрокаў па творы, тэматыка творчых работ, змест апераджальных заданняў да ўрокаў па творы. Адзначым пры гэтым, што мэтазгодна так выбудоўваць СПЛ, каб тэмы ўрокаў і тэмы творчых работ калі не супадалі, то былі падобнымі. Гэта дазваляе здзяйсняць сістэмную паэтапную падрыхтоўку як да адпаведных урокаў па творы, так і да творчых работ па ім.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вобразаў літаратурных герояў[1]; д) мастацка-выяўленчыя сродкі, якія спрыяюць характарыстыцы паліцаяў і немцаў; е) складнікі, паказчыкі канфлікту (-таў) у мастацкім свеце твора; роля мастацкага канфлікту ў раскрыцці характару герояў твора.

2. Прапанаваныя вышэй пазіцыі апераджальнага задання могуць выкарыстоўвацца настаўнікамі пры складанні дамашняга задання, скіраванага непасрэдна на ўрок па дадзенай тэме, а таксама могуць быць пакладзены ў аснову пытанняў (праблем), якія будуць абмяркоўвацца (вырашацца) на ўроку.

3. Дамашняе заданне да ўрока па дадзенай тэме: а) падрыхтаваць першыя варыянты творчых работ па тэмах "Што такое здрада і хто такі здраднік?", "Вобразы паліцаяў і фашыстаў у аповесці В. Быкава "Знак бяды": асаблівасці іх мастацкага адлюстравання" – для вучняў, якія абралі дадзеныя тэмы ў працэсе чытання аповесці[2]; б) скласці характарыстыку вобразаў Гужа, Каландзёнка, "прыезджых паліцаяў з Крынкаў"; в) падрыхтаваць характарыстыку вобразаў немцаў, якія гаспадарылі на хутары Багацькаў[3]; г) ахарактарызаваць асаблівасці канфлікту паміж Багацькамі і паліцаямі, Багацькамі і немцамі – выявіць яго ролю ў раскрыцці характараў літаратурных герояў і ідэйнага зместу твора; д) вызначыць вытокі Гужавай варожасці да Багацькаў і прыхільнасці да немцаў, а таксама акрэсліць вытокі здрадніцтва Каландзёнка.

4. Рэкамендацыі для вучняў пры тлумачэнні дамашняга задання да гэтага ўрока: варта зарыентаваць адзінаццацікласнікаў на зварот да тых раздзелаў і эпізодаў твора, якія дапамогуць эфектыўна выканаць заданні да ўрока па дадзенай тэме[4].

Такім чынам, прапанаваныя ў дадзеных тэзісах метадычныя зыходныя і рэкамендацыі да іх рэалізацыі садзейнічаюць, на наш погляд, дасягненню наступных вынікаў: а) фарміраванню ўменняў характарыстыкі вобразаў літаратурных герояў з пазіцыі псіхалагічнай устаноўкі, з улікам рэальнага і рэтраспекцыйнага мастацкага свету твора і тыпаў канфлікту у ім, вобразна-выяўленчых складнікаў аповесці; б) сістэмнай працы з мастацкім тэкстам: яго падзейнымі фактамі, сюжэтнымі асаблівасцямі, вобразна-выяўленчымі паказчыкамі і іх сэнсаўтваральнай роляй; в) фактуальна-доказнай характарыстыцы аднаго са складнікаў мастацка-філасофскай канцэпцыі В. Быкава пра чалавека: залежнасць цяперашняга і будучага жыцця чалавека, яго лёсу ў цэлым ад гістарычных абставін, якія здольныя разбурваць гэтае жыццё і перакрэсліваць гэты лёс.

[1] Гэтае заданне можа праецыравацца і на тэму ўрока "«Знак бяды»: тэматыка, праблематыка, канфлікт", якая вызначаецца ў прыкладным каляндарна-тэматычным планаванні [3, с. 63]. На наш погляд, разгляд пытання '*асаблівасці сюжэту і кампазіцыі*' дазволіць больш поўна раскрыць названую вышэй тэму ў гэтай спасылцы і тэму, якая вынесена ў загаловак дадзеных тэзісаў, з пазіцыі "звароту аўтара да эпізодаў даваеннага жыцця" [1, с. 14].

[2] Пры ўмове, што некаторыя з вучняў абралі такія тэмы творчых работ, улічылі пры іх падрыхтоўцы планы сачыненняў, якія распрацаваў настаўнік (або яны самі) у адпаведнасці з апераджальным заданнем, атрыманым перад чытаннем тэксту аповесці, гэтыя вучні могуць выступіць на ўроку як першыя памочнікі настаўніка ў працэсе характарыстыкі тэмы ўрока. Формы іх супрацоўніцтва з настаўнікам і астатнімі вучнямі: а) зачытванне фрагментаў разважанняў з іх творчых работ для падмацавання назіранняў і высноў настаўніка і аднакласнікаў; б) адсылкі да тэксту аповесці з мэтай ілюстрацыі характарыстыкі вобразаў паліцаяў і акупантаў. Акрамя гэтага, праца па тэме ўрока дазволіць гэтай частцы вучняў зрабіць некаторыя карэкціроўкі, удакладненні ў іх творчых работах.

[3] Пры тлумачэнні дамашняга задання абавязкова павінна звяртацца ўвага на тое, што вучні пры выкананні пунктаў "б" і "в" мусяць выкарыстоўваць матэрыял чытацкага дзённіка, падрыхтаванага ў адпаведнасці з апераджальным заданнем, атрыманым перад чытаннем аповесці.

[4] Да ліку такіх раздзелаў і эпізодаў адносяцца наступныя: 3 – першая сустрэча Багацькаў з Гужом і Каландзёнкам у іх новай ролі; 4 – погляд вачамі Сцепаніды з мінулага (1930 года) на Гужа і (аж да самай ваны) на Кландзёнка; 5 – першыя ўражанні Петрака і Сцепаніды на першага сутыкнення іх хутары з немцамі і іх перакладчыкам –"колішнім настаўнікам Свянтоўскімна; 6 – падрыхтоўка прыкамандзіраванымі да хутара немцамі хаты, нямецкай кухні і ежы да прыезду асноўнай каманды, што рамантавала мост; 7 – "ўсталёўванне немцаў надоўга"; першае выдойванне Карлам Бабоўкі; пакаранне фельдфебелем Сцепаніды за яе непакорнасць (падман з малаком); 8 – расстрэл немцамі вароны, знічшэнне яблык і ўраджаю буракоў, цыбулі, агуркоў на агародзе, паляванне на курэй – усё пры маўклівай згодзе афіцэра; выдойванне Сцепанідай каровы ў траву; другое – безвыніковае – выдойванне Карлам Бабоўкі; забойства фельдфебелем Бабоўкі; 9 – свежаванне немцамі застрэленай каровы; планаванне Сцепанідай знішчэння "забытай зранку" на кухні нямецкай вінтоўкі і здзяйсненне гэтага плана; 10 – "чалавечнасць" немца Карлы ў яго імкненні пачаставаць Багацькаў кавалкам прыгатаванага мяса забітай Бабоўкі; неадназначныя адносіны фельдфебеля да Гужа – ён для яго ўсё той жа, як і Сцепаніда з Петраком, парабак; 11 – забойства немцамі Янкі; прадчуванні Сцепанідай яе "канца", што "хутка набліжаўся"; 12 – факты з гісторыі раскулачвання Гужова Івана (старога Гужа); 15 – даваенная грамадская выкрывальніцкая дзейнасць Каландзёнка; помста Гужа Сцепанідзе і прыезджым агітатарам за раскулачванне бацькі, што адбылося "тыдзень назад"; 16 – апасродкаваныя і непасрэдныя характарыстыкі Каландзёнка у час раскулачвання; 17 – людскасць "пажылога таўставатага немца" ў яго поглядзе на забітага Янку перад ад'ездам з хутара; нечалавечнасць Гужа і Каландзёнка ў адносінах да "во гэтага" (цела забітага Янкі); непасрэдныя і апасродкаваныя характарыстыкі Гужа і Каландзёнка; 18 – утопленая Сцепанідай у калодзежы вінтоўка як знак яшчэ адной бяды, што прыйдзе ад немцаў; 20 – факты прыходу ў паліцыю "свайго кіраўніцтва – мясцовага, вобразы "прыезджых паліцаяў з Крынак"; здзекі паліцаяў (Гужа і Каландзёнка) з Петрака на наступны дзень ад наведвання хутара "прыезджымі паліцаямі з Крынак".



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Літаратура**[1]

1. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура" для XI класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання (базавы ўзровень) / Зацв. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 21.06.2021 № 131 / Рэжым доступу: https://adu.by/images/2021/08/up-bel-lit-11kl-baz-rus.pdf. Дата доступу: 21.01.21.

2. Быкаў, В. У. Выбраныя творы / В. У. Быкаў. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – 672 с.

3. Міхнёнак, С. С. Беларуская мова і літаратура : прыкладане каляндарна-тэматычнае планаванне : дапам. для настаўнікаў установ агул. сярэд. Адукацыі / С. С. Міхнёнак, В. І. Караткевіч. – Мінск : НІА : Аверсэв, 2021. – 104 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова